**Патапенка, П.** Другая Віцебская / П. Патапенка, І. Цімошчанка // Віцебскі рабочы. – 1973. – 20 сак. – С. 2.

## ДРУГАЯ ВІЦЕБСКАЯ

Наша партызанская брыгада зарадзілася ў Чанавіцкай дачы, на мяжы Віцебскага і Бешанковіцкага раёнаў. Тут к вясне 1942 года сабраліся многія жыхары навакольных вёсак Вяжышча, Гняздзілава, Чанавічы, Лучкі, Доўгае і іншыя, ваеннаслужачыя, якія выйшлі з акружэння або ўцяклі з палону. Тут яны аб'ядналіся ў партызанскую групу.

У чэрвені 1942 года гэта група злучылася з прыбыўшай сюды групай партызан з атрада М. Ф. Біруліна. Утварыўся атрад, які ў далейшым увайшоў у Першую Віцебскую партызанскую брыгаду пад № 1. Камандзірам яго быў прызначан Г. І. Сысоеў, камісарам І. Г. Грыгор'еў, начальнікам штаба П. З. Патапенка, намеснікам камандзіра па разведцы І. А. Цімошчанка, які прыбыў са спецгрупай з савецкага тылу.

Да позняй восені атрад дыслакаваўся ў Чанавіцкай дачы і вёў баявыя дзеянні ў заходняй частцы Віцебскага, усходняй частцы Бешанковіцкага і Сіроцінскага раёнаў.

У пачатку 1943 года па загаду камбрыга М. Ф. Біруліна ён перайшоў у паўночна-ўсходнюю Віцебскую партызанскую зону і стаў на яе рубяжах па правым беразе Дзвіны ад вёскі Койтава на Рубу – Вярхоўе – Цяцёркі і далей на поўнач ля вёсак Псярцы – Трыгубцы – Дзюганы. Тут ён нёс баявую ахову, перашкаджаючы пранікненню праціўніка з Віцебска і акружаючых яго гарнізонаў у зону партызан. Адсюль наносіў адчувальныя ўдары па гарнізонах, камунікацыях ворага. У лютым–сакавіку 1943 года атрад актыўна ўдзельнічаў у баях з буйной карнай экспедыцыяй фашыстаў, умела вёў баявыя дзеянні, выйшаў з блакады, захаваўшы асабовы састаў і зброю, і зноў заняў свае пазіцыі ля Віцебска. Тут на бок партызан перайшоў 825-ы волга-татарскі бятальён, сфарміраваны ворагам з ліку ваеннапалонных для барацьбы э партызанамі. Мы прынялі яго ў ноч з 22 на 23 лютага 1943 года на беразе Дзвіны ля вёскі Койтава з поўным узбраеннем. А раніцай 23 лютага ля вёсак Чырвоны Двор і Койтава абучаныя гітлераўцамі татары разам з намі білі па фашыстах з іх жа гармат, мінамётаў, аўтаматаў і вінтовак.

...26 красавіка ў вёсцы Кабылякі адбылося пасяджэнне Віцебскага падпольнага райкома КПБ. Абмяркоўваліся мерапрыемствы па далейшай актывізацыі партызанскіх дзеянняў.

На наступны дзень мы атрымалі загад № 9 па Віцебскай партызанскай брыгадзе, падпісаны Біруліным, Хабаравым, Крыцкім. Ён абвяшчаў:

«1. Для актывізаіцыі партызанскага руху на паўднёва-заходнім баку г. Віцебска, для росту партызанскіх войск выдзелічь з партызанскага атрада № 1 т. Сысоева групу лепшых байцоў і камандзіраў у колькасці 36 чалавек для выканання гэтай баявой задачы.

2. Гэту групу назваць 6-м партызанскім атрадам Віцебскай партызанскай брыгады.

3. Згодна з рашэннем Віцебскага РК КПБ ад 26 красавіка 1943 года зацвердзіць камандзірам 6-га атрада тав. Патапенку Паўла Захаравіча, камісарам – тав. Казлоўскага Васіля Максімавіча, начальнікам штаба – тав. Цімошчанку Ігара Арцёмавіча».

У пачатку мая атрад прыбыў да месца прызначэння і спыніўся ў Чанавіцкай дачы каля вёскі Камлі. Адсюль ён разгарнуў баявыя дзеянні супраць густой сеткі варожых гарнізонаў, наносіў удары па чыгунках з Віцебска на Полацк і Оршу, на шасэ Віцебск – Бешанковічы – Лепель і іншых.

Праціўнік рабіў шматлікія спробы знішчыць партызач. Але, маняўруючы сярод варожых гарнізонаў у сектары Віцебск – Шуміліна – Бешанковічы – Сянно – Віцебск, мы трывала ўтрымлівалі баявую ініцыятыву і наносілі ўдары па ворагу там, дзе ён не чакаў. Гэтаму садзейнічала актыўная дапамога мясцовых жыхароў. Нашы сувязныя ў Віцебску, Бешанковічах і многіх вёсках Віцебскага і Бешанковіцкага раёнаў своечасова інфармавалі нас аб намерах праціўніка, дастаўлялі ў атрад новае папаўненне з ліку мясцовых жыхароў і ваеннапалонных.

Нашы дзеянні сталі яшчэ больш паспяховымі з прыходам у гэты раён партызан брыгад «Аляксея», Ляонава, Шлапакова, палка Садчыкава і іншых. Разам з імі мы праводзілі шматлікія баявыя аперацыі. Да верасня 1943 года колькасць атрада перавысіла 500 чалавек.

Наспела неабходнасць ператварыць атрад у брыгаду. Па загаду ад 25 верасня 1943 года, падпісанаму былым сакратаром Віцебскага падпольнага абкома КПБ І. Б. Пазняковым на падставе распараджэння Беларускага штаба партызанскага руху, нам былі перададзены невялікія атрады Крыленкі і Стральцова з брыгады Біруліна, якія выйшлі раней з-пад Віцебска ва Ушацкуго зону. Так была створана Другая Віцебская партызанская брыгада. Узаемадзейнічаючы з брыгадамі Дуброўскага, «Аляксея», Мельнікава і іншымі, мы ў кастрычніку 1943 года прымалі ўдзел у штурме буйных гарнізонаў праціўніка ў Чашніках, Лепелі, выконвалі шэраг баявых заданняў аб'яднанага камандавання брыгад Дуброўскага і Лабанка па разгрому варожых гарнізонаў у Чашніцкім, Бешанковіцкім і Лепельскім раёнах, удзельнічалі ў баях з карнымі экспедыцыямі.

У сярэдзіне лістапада брыгада вярнулася ў раён Бешанковічы – Астроўна – Сянно і разам з брыгадамі «Аляксея», Ляонава, 1-й Заслонаўскай (Сяліцкага), Раманава, 2-ой Заслонаўскай (Комлева), папком Садчыкава зноў разгарнула там актыўныя баявыя дзеянні.

Штаб брыгады перамяшчаўся з аднаго населенага пункта ў другі, але асноўныя сілы часцей за ўсё выходзілі ў Чанавіцкую дачу.

У красавіку 1944 года Беларускі штаб партызанскага руху загадаў нам выйсці на новыя пазіцыі ў заходнія раёны Беларусі, да граніц з Літвой, і актывізаваць там партызанскую барацьбу. Чатыры атрады на чале з камбрыгам у маі 1944 года прыбылі ў раён Смаргонь – Свір – Астравец і да прыходу Савецкай Арміі вялі там актыўныя баі з фашыстамі, паліцаямі, мясцовымі нацыяналістамі.

Два атрады на чале з І. Цімошчанкам засталіся ў раёне Лукомля для атрымання абяцанага нам з-за фронту ўзбраення і боепрыпасаў. Толькі ў сярэдзіне мая яны маглі рушыць на злучэнне са сваімі асноўнымі сіламі. Але ў шляху следавання на рацэ Вілія па загаду камандуючага Бягомльскім партызанскім злучэннем І. М. Мачульскага прыйшлося ўступіць у цяжкія баі з буйной карнай экспедыцыяй.

За перыяд самастойных дзеянняў з мая 1943 года па чэрвень 1944 года атрадам, і затым брыгадай было разгромлена 13 варожых гарнізонаў, разбіты сем валасных упраў, спушчана пад адхон 17 эшалонаў, узарваны дзесяткі аўтамашын і фурманак з жывой сілай і ваеннай тэхнікай праціўніка, знішчаны дзесяткі шасейных і чыгуначных мастоў, тысячы рэек, шмат зброі і боепрыпасаў. Звыш дзвюх тысяч варожых афіцэраў, салдат і паліцэйскіх знайшпі магілу ад трапных куль народных мсціўцаў. Партызаны брыгады захапілі ў ворага 41 кулямёт, 124 аўтаматы, 598 вінтовак, 161 пісталет, 4 мінамёты, 29 тысяч патронаў і іншую ваенную амуніцыю. Састаў брыгады пры злучэнні з Савецкай Арміяй дасягнуў 728 чалавек.

Звыш 100 чалавек нашых баявых таварышаў загінулі ў баях з ворагам або памерлі ад ран. Іх астанкі знаходзяцца на віцебскай зямлі. Многія пахаваны ў раёне Чанавіцкай дачы і навакольных вёсак. Вораг знішчыў тут шмат нашых сувязных і мірных жыхароў, якія дапамагалі партызанам.

Нам здаецца, што трэба ўзвесці на ўзлеску Чанавіцкай дачы ля перакрыжавання шасэ Віцебск – Бешанковічы – Лепель з дарогай Доўгае – Лучкі, па якой партызаны часта выходзілі на баявыя аперацыі, Курган славы, каб увекавечыць памяць загінуўшых партызан 2-ой Віцебскай брыгады і мірных жыхароў, якія дапамагалі ім у барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. На кургане можа быць устаноўлена скульптура савецкага партызана або скульптурная кампазіцыя.

Трэба было б таксама ўстанавіць памятны знак ля вёскі Камлі – асноўнай базы нашай брыгады, а ў вёсках Замошша, Рубеж, Канева, Дольдзева, дзе размяшчаўся ў розны час штаб, – мемарыяльныя дошкі.

**П. ПАТАПЕНКА,**
**былы камандзір 2-й Віцебскай партызанскай брыгады**
**І. ЦІМОШЧАНКА,**
**былы начальнік штаба брыгады**